# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

20 сакавіка 2020 г. № 11 (547)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# КОЖНАЕ ДРЭЎЦА МАЕ СВАЁ МЕСЦА

## Што і дзе можна саджаць, каб упрыгожыць сталічныя вуліцы і двары

**Больш за два мільёны кветак, звыш 13 тысяч дрэў і каля 46 тысяч кустоў высадзяць сёлета на сталічных вуліцах. Навінкай 2020-га стане з'яўленне на раздзяляльных лініях уздоўж дарог жывой агароджы з кустоў. Акрамя таго, у кожным адміністрацыйным раёне Мінска арганізуюць клумбу, прысвечаную 75-годдзю Перамогі. Якія расліны парадуюць беларусаў і гасцей Мінска ў гэтым сезоне і чым можа дапамагчы азеляняльнікам кожны з нас, карэспандэнт запыталася ў спецыялістаў.**

стар. 13

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# 25 ПЫТАННЯЎ ЗА ТРЫ ГАДЗІНЫ

## Менавіта столькі было званкоў, якія паспела прыняць падчас прамой тэлефоннай лініі старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА

Праўду кажучы, калі лічыць па колькасці, пытанняў атрымаецца значна больш: многія з заяўнікаў агучвалі па дзве-тры, а то і больш праблемных тэм запар, карыстаючыся магчымасцю быць пачутымі на высокім узроўні. Тэлефон працаваў у рэжыме нон-стоп, ні на секунду не сціхаючы: людзі агучвалі як свае жыццёвыя праблемы, крыўду на нейкую сітуацыю, так і цікавыя прапановы і ініцыятывы. Але пра ўсё падрабязней.

стар. 2

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Аператыўна і эфектыўна



Разгляд зваротаў у крыху іншым фармаце апрабавалі ў Савеце Рэспублікі. стар. 3

### Крона горада



У Гродне перасаджваюць нават дарослыя дрэвы — дыяметрам да 18 сантыметраў. стар. 14

### Цікавы вопыт



У Чэрвеньскім раёне Міншчыны жыхары актыўна ўдзельнічаюць у азеляненні. стар. 14

### Плюс 21 суботнік



Як у Папінскім сельсавеце, што на Брэстчыне, падтрымліваюць парадак агульнымі намаганнямі. стар. 15

### Імянныя лаўкі



Цікавы праект па добраўпарадкаванні рэалізуецца ў Брэсце. стар. 16